КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А. В. Макоўчык
«15» 06 2018 г.
Рэгістрацыйны № УД - ________/уч.
26-1 № 5 2018

# Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па факультатыўнай дысцыпліне для спецыяльнасцей профіля А- педагогіка

2018 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі 1 ступені па спецыяльнасцям профіля А – Педагогіка.

**Складальнік:**
А.Ф. Рацько, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 10 ад 24.04.2018 г.)

Загадчык кафедры А.Ф.Вялікі

Саветам гістарычнага факультэта
(пратакол № 10 от 24.05.2018 г.)

Старшыня А.В.Касовіч

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючыя яе матэрыялы дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядаюць.

Метадыст вучэбна-метадычнага
ўпраўлення БДПУ Г.В.Вінаградава

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь з’яўляецца адной з задач гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі. Вызначальным у працэсе выхавання і арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў становіцца фарміраванне сістэмы каштоўнасцей, якія падзяляюцца ўсімі прадстаўнікамі нашага грамадства, у тым ліку моладдзю. Найважнейшай сярод гэтых каштоўнасцей бачыцца патрыятызм як любоў да Радзімы і гатоўнасць да абароны незалежнасці і суверэнітэту сваёй дзяржавы.

Без грунтоўных ведаў гісторыі сваёй Айчыны і асабліва яе складаных і супярэчлівых перыядаў,без уліку станоўчага і адмоўнага вопыту жыцця міжнароднай супольнасці, беларускага этнасу і нацыянальных меншасцяў нельга паспяхова будаваць грамадскія ўзаемаадносіны ў сучаснасці.

Асноўнай мэтай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі з’яўляецца фарміраванне і развіццё сацыяльна-асабовых кампетэнцый і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач і функцый.

Таму асноўнымі задачамі вызначаны наступныя:

- фарміраванне грамадзянскіх і патрыятычных якасцяў асобы;
- выхаванне ў студэнцкай моладзі пачуцця адказнасці за будучыню сваёй дзяржавы і сусветнага супольніцтва;
- засваенне вучэбнай інфармацыі аб гераічных і трагічных старонках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, аб жыцці насельніцтва на акупіраваных тэрыторыях і ў савецкім тыле, аб укладзе прадстаўнікоў шматнацыянальнага беларускага народа ў разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў, аб уплыве ваенных падзей на лёсы народаў Еўропы і Савецкага Саюза.

Праграма факультатыва “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (ў кантэксце Другой сусветнай вайны)” складзена на аснове навейшых дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі з улікам вяўленых невядомых раней архіўных дакументаў і матэрыялаў. Айчынная гісторыя падаецца ў праграме ў кантэксце сусветнай з выкарыстаннем сучасных метадалагічных падыходаў,звязаных з асвятленнем вайны як з’явы ў жыцці чалавецтва і накіраваных на рэалізацыю прыміраючай функцыі гісторыі. Праграма складецца з 5 тэм.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

- асноўныя падзеіў Еўропе і свеце напярэдадні Другой сусветнай вайны;
- прычыны Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны;
- сутнасць акупацыйнага рэжыму фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі СССР;
- асноўныя этапы партызанскай і падпольнай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі;
- гістарычнае значэнне подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**умець:**

- выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу і ацэнкі Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа;
- тлумачыць ролю і значэнне партызанскай і падпольнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі для перамогі над ворагам;
- выкаростоўваць гістарычны вопыт для аналізу і ацэнкі сучасных праблем міжнароднай палітыкі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**валодаць:**

- навыкамі работы з навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратурай;
- метадамі інтэрпрытацыі з'яў і фактаў гісторыі з пункту погляду ролі савецкага народа ў перамозе над фашысцкай Германіяй у гады Вялікай Айчыннай вайны;
- навыкамі асэнсаванага выкарыстання новых фактаў гісторыі з мэтай папярэджання памылак пры інтэрпрытацыі падзей Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнт установы вышэйшай адукацыі павінен развіць наступныя акадэмічныя кампетэнцыі (АК):

- АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.
- АК-4. Умець працаваць самастойна.
- АК-5. Валодаць крэатыўнасцю.
- АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з кампутарам.
- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

У адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнт установы вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы па адукацыйнай праграме першай ступені павінен набыць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі (САК):

- СЛК-1. Обладать качествами гражданственности.
- СЛК-2. Быть способным к социальному взаимодействию.
- СЛК-3. Обладать способностью к межличностным коммуникациям.
- СЛК-7. Быть способным осуществлять самообразование и совершенствовать профессиональную деятельность.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнт установы вышэйшай адукацыі павінен развіць наступныя прафесійныя кампетэнцыі (ПК):

- ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

Праграма факультатыва разлічана на 10 лекцыйных гадзін для студэнтаў дзеннай формы атрымання адукацыі і 2 лекцыйныя гадзіны для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Усяго аудыторных гадзін | Лекцый |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. Уводзіны. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 2 |
| 2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны рэжым. | 2 | 2 |
| 3. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі. | 2 | 2 |
| 4. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта. | | |
| 5. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. | 2 | 2 |
| Усяго: | 10 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Тэма 1. Уводзіны. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны

Прадмет, мэты і задачы факультатыва, яго структура і змест.

Актуальнасць вывучэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Навуковыя плыні і гістарычныя школы. Гістарыяграфія  і крыніцы. база. Перыдыязацыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Савецкі народ ў гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Міжнародная дзейнасць Германіі ў  30-х гадах XX ст. Ачагі ваеннай напружанасці (Далёкі Усход, Еўропа, Афрыка). Фарміраванне фашысцкага блоку. Антыкамінтэрнаўскі пакт. СССР і Ліга Нацый. Грамадзянская вайна ў Іспаніі.

Мюнхенскае пагадненне. Падзел Чэхаславакіі. Спроба стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-французска-англійскія перамовы. Савецка-германскія дагаворы. Сакрэтны пратакол.

Пачатак Другой сусветнай вайны. Напад Германіі на Польшчу. Аб'яўленне вайны Францыяй і Вялікабрытаніяй Германіі.Прычыны характар вайны.

Уступленне войск Чырвонай Арміі ў заходнія вобласці Беларусі і Украіны. Уз'яднанне Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.

Становішча ў заходніх рэгіёнах Савецкага Саюза. СССР і краіны Балтыі. Савецка-фінская вайна. Удзел беларусаў у фінскай кампаніі.

"Дзіўная вайна". Акупацыя Германіяй Даніі, Нарвегіі, Бельгіі, Галандыі і Люксембурга. Наступленне германскіх войск у Францыі. Капітуляцыя Францыі. Берлінскі пакт. Агрэсія Германіі на Балканах. Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Пакт аб нейтралітэце паміж СССР і Японіяй.

Пачатак Руху Супраціўлення. Падрыхтоўка Германіі да вайны з СССР. Прыняцце плана "Барбароса".

СССР у перадваенныя гады. Мерапрыемствы па ўмацаванню абараназдольнасці краіны.Ваенна-патрыятычная і ваенна-абарончая работа сярод насельніцтва.

Узброеныя сілы Савецкага Саюза. Заходняя Асобая ваенная акруга.

### Тэма 2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны рэжым

Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. "Маланкавая вайна". Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці.

Дзейнасць савецкіх і партыйных органаў па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам. Дзяржаўны камітэт Абароны (БКА).Перавод прамысловасці на ваенныя рэйкі. Эвакуацыя насельніцтва, матэрыяльных рэсурсаў і іншых каштоўнасцяў у тыл СССР.

Знішчальныя атрады і народнае апалчэнне. Баявыя дзеянні на франтах.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Абарончыя баі пад Мінскам, Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам, Гомелем. Гераізм савецкіх воінаў. Дапамога насельніцтва Чырвонай Арміі.

Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп і падпольных арганізацый. (М.Ф.Шмыроў, В.З.Корж, І.З.Ізох, І.А.Ярош, М.І.Жукоўскі і інш.). Першыя партызаны - Героі Савецкага Саюза (Ц.П.Бумажкоў, Ф.І.Паўлоўскі).

Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

Дзейнасць СССР на міжнароднай арэне. Ваенна-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Савецкім Саюзам Вялікабрытаніяй і ЗША. Пачатак стварэння антыгітлераўскай кааліцыі. Ваенныя дзеянні у канцы 1941 года. Уступленне ў вайну ЗША і Японіі. Маскоўская бітва. “Віцебскія вароты”.

Генеральны план “Ост”. Ваенна-эканамічныя мэты захопнікаў. Ваенна-паліцэйскія органы кіравання. Тэрытарыяльны падзел акупіраванных заходніх рэгіёнаў СССР. Рэйхскамісарыяты “Остланад” і “Украіна”.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел акупіраванай тэрыторыі: Генеральная акруга Беларусь, Генеральная акруга Жытомір, Генеральная акруга Валынь – Падолія; Генеральная акруга Беласток, вобласць армейскага тылу групы армій “Цэнтр”.

Акупацыйны апарат кіравання. Склад і структура. Генеральны камісарыят Беларусі, абласныя камісарыяты, раённыя і валасныя управы. Дапаможныя акупацыйныя арганы кіравання.

Палітыка генацыду. Знішчэнне насельніцтва і ваеннапалоных. Злачынная дзейнасць СС, службы бяспекі (СД). Айнзацгрупы і зондэркаманды. Карныя экспедыцыі. Канцэнтрацыйныя лагеры, турмы. Гета. Вываз насельніцтва на прымусовую працу ў Германію. “Остарбайтэры”. Удзел венгерскіх, італьянскіх, французскіх, румынскіх, славацкіх, а таксама украінскіх, рускіх, літоўскіх, латышскіх, эстонскіх, остмусульманскіх і іншых ваенна-паліцэйскіх фарміраванняў ва ўмацаванні германскага акупацыйнага рэжыму. Ваенна-эканамічныя фарміраванні.

Калабарцыянізм. Беларуская народная самадапамога (БНС), Беларуская самаахова (БСА), Рада Даверу (РД), Саюз беларускай моладзі (СБМ), Беларуская цэнтральная рада (БЦР), Беларуская краявая абарона (БКА). Дапаможныя паліцэйскія фарміраванні.

Германская прапаганда і агітацыя: формы і метады. Школа, тэатр, друк, радыё, царква. Палітыка міжнацыянальных адносін. Эканамічная і сельска-гаспадарчая палітыка германскіх акупацыйных улад. Рабаванне матэрыяльных рэсурсаў і культурных каштоўнасцяў. Паўсядзёнасць жыцця насельніцтва ва ўмовах акупацыі.

## Тэма 3. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі

Станаўленне і развіццё партызанскага руху і падпольнай барацьбы. Дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый ва ўмовах акупацыі.

Стварэнне Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху. Партызанскія атрады і брыгады. Арганізацыйная структура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Баявая дзейнасць партызан. Дыверсіі на чыгунцы і шашэйных дарогах. Рэйкавая вайна і яе мэты. Разгром варожых гарнізонаў. Партызанскія рэйды. Партызанская разведка. Барацьба супраць карных экспедыцый. Узаемадзеянне беларускіх, рускіх, украінскіх, літоўскіх і латышскіх партызан. Роля партызанскага руху ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў.

Узаемаадносіны партызан і насельніцтва. Выратаванне насельніцтва ад знішчэння і прымусовага ўгону у Германію. Партызанскія зоны.

Арганізацыйнае ўмацаванне партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый. Узмацненне антыгерманскага супраціўлення на акупіраваннай тэрыторыі Беларусі. Пашырэнне партызанскіх зон. Партызанскія рэзэрвы. Быт партызан. Прапаганда і агітацыя сярод насельніцтва. Культурна-асветніцкая дзейнасць партызан.

Партыйнае, камсамольскае, антыфашыстскае падполле. Арганізацыйная структура і склад. Формы і метады барацьбы патрыётаў. Камсамольска-маладзёжнае падполле. Дзейнасць падпольшчыкаў Мінска, Магілёва, Гомеля, Брэста, Гродна, і інш. гарадоў Беларусі. Дыверсійная работа на чыгуначных вузлах Оршы, Асіповіч, Калінкавіч, Полацка і інш. Складанасці і цяжкасці падпольнай і дыверсійнай барацьбы. Узаемаадносіны і ўзаемадзеянне падпольшчыкаў і партызан.

Антыфашысцкія патрыятычныя групы і арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета і ў канцэнтрацыйных лагерах.

Дапамога савецкага тыла і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам.

Армія Краёва і яе формы барацьбы. Узаемаадносіны Арміі Краёвай з савецкімі партызанамі і мясцовым насельніцтвам.

**Тэма 4. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта**

Расшырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, міжземнамор'і і на Ціхім акіяне.

Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне. Пачатак распаду фашысцкага блоку. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя. Пытанне аб Другім фронце.

**Тэма 5. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Савецкі тыл у гады вайны. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў**

Пачатак вызвалення Беларусі. Першы вызвалены раённы цэнтр – Камарын. Вызваленне Гомеля, Рэчыцы. Узаемадзеянне партызан, насельніцтва і войск Чырвонай Арміі. Першыя аднаўленчыя мерапрыемствы.

Становішча на савецка-германскім фронце. Беларуская наступальная аперацыя “Багратыён”. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. “Рэйкавая вайна”.

Акружэнне і разгром германскіх груповак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам і інш. Вызваленне Мінска. Партызанскі парад. Прыклады гераізму воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў. Выгнанне германскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Вызваленне Брэста. Значэнне разгрому германскіх войск у Беларусі. Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі.

Перавод эканомікі на ваенныя рэйкі развіцця. Дзейнасць Камітэта Абароны. Ваенна-прамысловае будаўніцтва на Урале, Сібіры, Сярэдняй Азіі. Усход – асноўная ваенна-прамысловая база СССР. Працоўны подзвіг савецкага народа. “Усё для фронта!” Усё для перамогі!”.

Сацыяльна-эканамічнае, культурае і духоўнае жыццё савецкага народа. Палітычная агітацыя і прапаганда.

Дзейнасць беларускіх ўстаноў і арганізацый ў тыле (Акадэмія Навук БССР, ВНУ, дзіцячыя дамы і г. д.). Ураджэнцы Беларусі – героі тыла.

Адкрыццё Другога фронту. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Еўропу. Падзеі ў Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі. Крымская канферэнцыя. Берлінская аперацыя. Сустрэча на Эльбе. Разгром германскай арміі. Заканчэнне вайны ў Еўропе. Капітуляцыя Германіі, Перамога! Патсдамская канферэнцыя.

Удзел воінаў беларусаў на франтах Вялікай Айчыннай вайне. Беларусы ў складзе саюзных армій і Еўрапейскага руху Супраціўлення.

Манжурская аперацыя войск Чырвонай Арміі. Бамбардыроўка ЗША Херасімы і Нагасакі. Капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Вынікі і ўрокі.

Беларусь – адна з краін-заснавальніц ААН. Нюрбергскі працэс. Уклад беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі. Людскія і матэрыяльныя страты беларускага народа.

Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі. Ураджэнцы Беларусі – Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы.

Гарады героі. Мемарыяльныя комплексы: “Трэптаў парк”(Берлін). “Паклонная гара” (Масква). “Мамаеў курган” (Валгаград) “Брэсцкая крэпасць – герой”, “Хатынь”, “Трасцянец”, “Курган Славы”.

Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчыя музеі. Хроніка “Памяць”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вучэбна-метадычная карта факультатыўнай дысцыпліны “Вялікая айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”**

(дзенная форма атрымання адукацыі)

| Нумар тэмы | Назва тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | | |
| 1. | **Уводзіны. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.**<br>1. Прадмет, мэты і задачы факультатыва, яго структура і змест.<br>2. Пачатак Другой сусветнай вайны<br>3. СССР у перадваенныя гады. | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [1]<br>[3] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2. | **Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Акупацыйны рэжым.**<br>1. Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці.<br>2. Палітыка генацыду. Знішчэнне насельніцтва і ваеннапалоных.<br>3. Паўсядзёнасць жыцця насельніцтва ва ўмовах акупацыі. | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Дакументаль-ная стужка. | [1]<br>[3]<br>[2]<br>[6]<br>[5] | |
| 3. | **Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі.**<br>1. Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп і падпольных арганізацый.<br>2. Стварэнне Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху. Партызанскія атрады і брыгады. Арганізацыйная структура.<br>3. Антыфашысцкія патрыятычныя группы і арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета і ў канцэнтрацыйных | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Дакументаль-ная стужка. | [1]<br>[3]<br>[2]<br>[6]<br>[4]<br>[5] | |
| 4. | **Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта.**<br>1. Расшырэнне маштабаў Другой сусветнай вайны. Перамогі саюзных войск у Афрыцы, міжземнамор'і на Ціхім акіяне.<br>2. Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне. Пачатак распаду фашысцкага блоку. | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [1]<br>[5]<br>[7]<br>[8] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5. | **Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.**<br>1. Пачатак вызвалення Беларусі/<br>2. Становішча на савецка-германскім фронце. Беларуская наступальная аперацыя “Багратыён”. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. “Рэйкавая вайна”.<br>3. Міжнароднае значэнне Перамогі над германскім агрэсарам і яго саюзнікамі. | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. Дакументаль-ная стужка. | [1]<br>[3]<br>[6]<br>[9]<br>[10] | |
| | **Усяго** | **10** | | | | **Праслухана** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вучэбна-метадычная карта факультатыўнай дысцыпліны “Вялікая айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”**
(завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар тэмы | Назва тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | | |
| 1. | **Уводзіны. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак Другой сусветнай вайны і падзеі ў Беларусі. Акупацыя Германіяй краін Еўропы. СССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.**<br>1. Прадмет, мэты і задачы факультатыва, яго структура і змест.<br>2. Пачатак Другой сусветнай вайны<br>3. СССР у перадваенныя гады.<br>4. Напад Германіі на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці. | 2 | | Мульты-медыйная прэзентацыя. | [1]<br>[3]<br>[2]<br>[6]<br>[5] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп і падпольных арганізацый.<br>6. Падзеі на франтах вайны. Крушэнне наступальнай стратэгіі германскага вермахта.<br>7. Вызваленне Беларусі ад германскіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. | | | | | |
| | | **2** | | | | **Праслухана** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура

1. Каваленя, А. А. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа : (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вучэб. дапам. / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск :Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 278 с.
2. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск : Беларуская навука, 2016. – 495 с.
3. Атлас Победы: Великая Отечественная война 1941 – 1945 гг. Front Cover. Просвещение, 2016 – World War, 1939–1945 – 295 с.

### Дадатковая літаратура

4. Дети лихолетья : документальные очерки и повести / В. П. Павлов. – Минск : Беларуская навука, 2017. – 399 с.
5. Никто не забыт, ничто не забыто: сб. науч. материалов : (к 70-летию Победы над милитаристской Японией и окончания Второй мировой войны) / сост.: Я. П. Безлепкин, А. В.Берянев, А. П.Соловьянов ; редкол.: В. В. Данилович и др. – Минск : Колорград, 2016. – 225 с.
6. Этот день мы приближали, как могли… : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию Победы в Великой Отечественной войне и окончания Второй мировой войны (Минск, 7-8 мая 2015 г.). В 2 ч. – Минск : Беларуская навука, 2016. – 260 с.
7. Страна в огне: В 3 т. Т. 2. Коренной перелом. 1942–1943 : В 2 кн. Кн. 1. Очерки / Отв. ред. Литвин А. М., Никифоров Ю. А. — М.: «Абрис», 2017. – 734 с.
8. Страна в огне: В 3 т. Т. 2. Коренной перелом. 1942–1943 : В 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы. Отв. ред. Литвин А. М., Никифоров Ю. А. – М.: «Абрис», 2017. – 542 с.
9. Страна в огне: В 3 т. Т. 3. Освобождение. 1944–1945 : В 2 кн. Кн. 1. Очерки / Отв. ред. Литвин А. М., Мягков М. Ю.; ред.-сост. Суржик Д. В. – М.: «Абрис», 2017. – 717 с.
10. Страна в огне: В 3 т. Т. 3. Освобождение. 1944–1945 : В 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы / Отв. ред. Литвин А. М., Мягков М. Ю.; ред.-сост. Суржик Д. В. – М.: «Абрис», 2017. – 510 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, распрацаваўшай вучэбную праграму (з вызначэннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Пытанні па Другой Сусветнай вайне разглядаюцца больш падрабязна. | Пратакол № 10 ад 24.04.2018 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ